Акрамя таго, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, дзякуючы сродкам фонду Прэзідэнта, папоўніцца комплексам рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў. Будуць закуплены ўнікальныя кніжныя выданні і архіўныя дакументы, паведаміў намеснік генеральнага дырэктара ўстановы Алесь Суша. Гаворка ідзе аб вельмі дарагіх і каштоўных асобніках. Гэта, напрыклад, адно з прыжыццёвых выданняў Мялецiя Сматрыцкага. У ліку рарытэтаў і найкаштоўнейшы рукапіс татараў Беларусі — хамаіл, напісаны на беларуска-польскай мове арабскімі літарамі. З комплексу архіўных дакументаў з розных рэгіёнаў Беларусі цалкам унікальнымі з'яўляюцца дзве граматы каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх канца XVI — пачатку XVII стагоддзяў.